# СТВАРАЛЬНІКІ САРТОЎ З ЖОДЗІНА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Створаны генетычны банк, без якога сучасная селекцыя ўвогуле немагчымая. Пабудавана лінія сушкі насення, узводзіцца корпус насеннятоўства. Нядаўна тут прайшоў Дзень адчыненых дзвярэй. Госці, а гэта былі пераважна маладыя людзі, школьнікі старэйшых класаў, наведалі аддзел біяхіміі і біятэхналогіі, агледзелі найноўшае абсталяванне і ўбачылі на свае вочы, як працуе навуковая лабараторыя. Ім таксама паказалі Нацыянальны банк генетычных рэсурсаў раслін, у якім знаходзіцца калекцыйны матэрыял раслін.

У цэнтра шмат замежных партнёраў-селекцыянераў не толькі з бліжняга замежжа, але і з іншых кантынентаў.

— Мы супрацоўнічаем з навукоўцамі Расіі, Украіны, іншых краін СНД, а таксама Германіі, Польшчы, Швейцарыі, Балгарыі, Даніі. Праводзім сумесныя даследаванні, абменьваемся навуковай інфармацыяй, селекцыйнымі матэрыяламі. За межамі Беларусі нашы сарты і гібрыды займаюць каля трох мільёнаў гектараў. Гэта значыць, мы здольныя канкурыраваць з замежнымі сартамі насення, — гаворыць Фёдар Прывалаў.

Дарэчы, 15 сартоў цэнтра прызнаны ўнікальнымі ў Еўропе. Зараз яны размешчаны на востраве Шпіцберген на захоўванне ў планетарным сховішчы насення Зямлі. Нагадаем, Сусветны банк пасадкавага матэрыялу створаны ў 2006 годзе пад эгідай ААН для захавання ўсіх сельскагаспадарчых раслін, якія існуюць у свеце. Уласную ячэйку ў гэтым банку мае кожная краіна.

Штогод шмат замежных гасцей наведвае цэнтр. Летась сюды нават завіталі афіцыйныя дэлегацыі з Мазамбіка і кітайскай Акадэміі аграрных навук правінцыі Цзілінь.

Ці маглі б здабыткі навукоўцаў быць больш значнымі? Так, лічыць кіраўнік цэнтра. Сістэма насеннятоўства ў Беларусі ў стане поўнасцю забяспечыць спажыўцоў кандыцыйным, высакаякасным насеннем. Аднак спецыялізаваных гаспадарак, а іх у рэспубліцы 90, маюць патрэбу ў карэнным абнаўленні матэрыяльна-тэхнічнай базы, а сама сістэма — у аптымізацыі. Гэту работу актывізавалі ў Год навукі. 5 мая ў цэнтры будзе праходзіць другі Міжнародны форум хлеба. Распрацавана праграма развіцця селекцыі і насеннятоўства збожжавых, зернебабовых, тэхнічных і кармавых культур. У ёй дэталёва абгрунтаваны этапы, меры, патрэбнасць у тэхнічных сродках, неабходныя структурныя і арганізацыйныя змены ў сістэме насеннятоўства.



Гэты Год навукі для цэнтра асабліва яшчэ і таму, што ў ліпені яго калектыў будзе адзначаць 90-годдзе з дня заснавання. За гэты час ён прайшоў шлях ад невялікага інстытута да навукова-практычнай установы з сусветнай вядомасцю. Прыедуць шмат замежных вучоных, спецыялістаў-практыкаў. З нагоды юбілею запланаваны шэраг мерапрыемстваў. Адно з іх: адкрыццё Алеі вучоных цэнтра, якая будзе знаходзіцца побач з будынкам інстытута ў Жодзіне. Каб нашчадкі былых і сённяшніх селекцыянераў ведалі і ганарыліся сваімі славутымі папярэднікамі.

**Леанід ТУГАРЫН.**

■ Погляд

# АБ АДНЫМ МАРШЫ...

**У невялікім польскім горадзе Гайнаўка 26 лютага павінен прайсці марш у памяць аб так званых праклятых жаўнерах, ваярах Арміі Краёвай, якія змагаліся за незалежнасць Польшчы падчас Другой сусветнай вайны, нават калі польскі ўрад загадаў зламаць зброю і не перашкаджаць савецкім войскам ісці на Берлін.**

**Здавалася б, нічога дрэннага ў гэтым няма. Палякі ўшаноўваюць сваіх герояў у сваім горадзе і маюць на гэта поўнае права, але... Вось калі б не гэта «але», якое складаецца з невялічкіх, але вельмі важных дробязяў, якія робяць гэты марш, мякка кажучы, незразумелым.**

**Мерапрыемства будзе праводзіцца ў Гайнаўцы ўжо другі раз, і мінулы марш паказаў, што гэта падзея — не свята памяці аб трагедыі вайны, а хутчэй дзень нецярпімасці, калі ўбіваюць новыя кліны паміж людзьмі і падаўжаюць ланцуг нянавісці і ўзаемных абвінавачанняў у польскім грамадстве.**

## ТРОШКІ ГІСТОРЫІ

Постаці «праклятых жаўнераў» даволі супярэчлівыя для самых палякаў, не кажучы ўжо пра нацыянальныя меншасці, якія жывуць у Польшчы і чые продкі сутыкнуліся з імі падчас Другой сусветнай вайны.

Іх шануюць за тое, што яны імкнуліся да аднаўлення незалежнасці і суверэнітэту сваёй краіны. Але пры гэтым яны імкнуліся ў крывавай барацьбе з украінцамі, літоўцамі і беларусамі захаваць за Польшчай сталіцу сучаснай Літвы — Вільнюс, а таксама ўкраінскія і беларускія землі, якія з 1921 па 1939 («ажно» 18 гадоў!) знаходзіліся ў складзе Польшчы. Гэты момант да нашага часу не дае спакою ўльтраправым нацыяналістам, дагэтуль некаторыя паляки зняважліва называюць сучасную Беларусь і Украіну «крэсамі», г. зн. «ускраінай» Польшчы.

Аднак «праклятыя жаўнеры» не проста змагаліся з нямецкімі і савецкімі арміямі. Яны таксама адзначыліся і «работай» з мясцовым насельніцтвам. Напрыклад, атрады Стаўбцоўскага злучэння Арміі Краёвай са снежня 1943 да канца чэрвеня 1944 забілі каля шасці тысяч мірнага насельніцтва на падставе іх прыналежнасці да «бальшавікоў» (на тэрыторыі, якая да 1939 года належала БССР, і да бальшавікоў на ёй можна было аднесці каго хочаце). У Лідскай акрузе з лютага па красавік 1944 года ад рук «акаўцаў» (АК) загінулі некалькі тысяч чалавек. Забойствы суправаджаліся здзекаваннямі, пагромамі і рабаваннямі.

«Праклятыя жаўнеры» каралі беларускае насельніцтва не толькі за сувязь з партызанамі, за сімпатыі да Чырвонай арміі і савецкай улады, але часам з нацыяналістычных і рэлігійных меркаванняў — таму, што гэтыя людзі не каталікі і па нацыянальнасці не палякі.

І менавіта там, дзе асабліва актыўна «праклятыя жаўнеры» змагаліся з мясцовым насельніцтвам, ужо другі раз запар збіраюцца праводзіць марш у іх гонар...

## ТРОШКІ ГЕАГРАФІІ

Гайнаўка — гэта адзін з самых усходніх гарадоў Польшчы на памежжы з Беларуссю. Паводле вынікаў перапісу насельніцтва 2002 года, у Гайнаўцы самая вялікая ўдзельная вага беларусаў сярод усіх гарадоў Польшчы, яны складаюць больш за палову насельніцтва 22-тысячнага горада.

Менавіта тут ваяваў адзін з самых вядомых «праклятых жаўнераў» — Рамульд Райс (мянушка Буры), які ажыццяўляў сапраўдныя этнічныя чысткі ў ваколіцах гэтага горада ў пачатку 1946 года. Група Бурага толькі з 30 студзеня па 2 лютага 1946 года «пакарала смерцю» 80 беларусаў, у тым ліку жанчын і дзяцей. Райс і яго салдаты расстрэльвалі людзей, seklі іх сякерамі, спальвалі, гвалтавалі дзяўчат і забівалі іх пры супраціўленні. Было шмат забойстваў у вёсках Старыя Пухалы (Puchaly Stare), Заляшаны (Zaleszany), Зане (Zanie).

Пакараны смерцю ў 1950 годзе, капітан Райс быў рэабілітаваны ў 1995 годзе судом Варшаўскай ваеннай акругі. У пастанове суда даводзіцца, што прысуд капітану Райсу адменены таму, што ён «змагаўся за незалежнасць польскай дзяржавы» і, выдаючы загады, якія датычыліся ў тым ліку «пацыфікацыі» беларускіх вёсак, дзейнічаў у сітуацыі «вышэйшай неабходнасці, якая прымушала яго выконваць азначаныя дзеянні не заўсёды этычна».

Вядома, беластоцкі філіял польскага Інстытута нацыянальнай памяці кваліфікаваў падзеі ў вёсцы Заляшаны як злачынства з прыкметамі генацыду, але менавіта з лозунгамі ў гонар памяці Бурага ў мінулым годзе ішлі ўдзельнікі першага маршу. І гэта выглядала так, нібы яны ішлі па касцях і крыві з дзяцей і ўнукаў тых, каго тут забіваў Райс са сваімі жаўнерамі.

Дык навошта менавіта тут праводзіць марш, навошта турбаваць памяць загінулых і падымаць на шчыт, мякка кажучы, неадназначную асобу? Арганізатары марша кажуць, што такім чынам яны ламаюць нібыта існуючае табу на сцвярджэнне сваёй «польскасці» і шанаванне польскіх герояў ва ўсходніх рэгіёнах краіны.

Але ці не падаецца арганізатарам, што замест гэтага ствараецца штучная падстава для падзелу горада на палякаў і беларусаў, на «патрыётаў» і «камуністаў»?

Хоць улады горада не далі дазволу на правядзенне гэтага мерапрыемства, арганізатары абяцаюць прывезці з усёй Польшчы яшчэ больш «сапраўдных патрыётаў» і правесці марш нягледзячы ні на што.

## ТРОШКІ ПАЛІТЫКІ

Дык усё ж навошта праводзіць такі марш у такім месцы і ў такі час?

На гэтае пытанне можа быць некалькі адказаў. Па-першае, гэта можа быць дэманстрацыя сілы польскіх ультраправых арганізацый, якія жадаюць правядзення больш нацыяналістычнай арыентаванай палітыкі ад кіруючай праваканcерватыўнай партыі «Права і Справядлівасць». Па-другое, праводзячы такія мерапрыемствы ва ўсходніх рэгіёнах, яны адначасова дэманструюць мясцоваму насельніцтву нявыгаднасць і небяспечнасць самаідэнтыфікацыі сябе як «не палякаў», нібы нагадваючы, што справы Райса можна і паўтарыць.

Не будзе гэта спрыяць і беларуска-польскім адносінам. Вядома, што нацыянальныя меншасці з'яўляюцца адным з лакаматываў двухбаковых кантактаў і ўзаемаразумення. Але было б дзіўна, калі б беларусы падабалася такая дэманстрацыя «братэрскіх адносін» паміж народамі. Таксама, як і правядзенне, скажам, у Гродзенскай вобласці (ці ў любой іншай) марша ў гонар ліквідацыі жаўнераў АК вызвала б законнае абурэнне польскай грамадскасці, калі не МЗС.

У польскім грамадстве відавочна нарастаюць правыя і праваапапулісцкія настроі, якія выкарыстоўваюць гісторыю ў якасці грунту для стварэння міфа пра бездакорную і гераічную польскую нацыю. Гэтыя міфы прываблваюць палякаў марай пра вялікую і моцную краіну, якая з'яўляецца моцным гульцом на еўрапейскай і сусветнай арэне. І ў такіх марах няма нічога дрэннага, пакуль гэта не звязана з самасцвярджэннем за кошт іншых народаў, пошукам страчаных тэрыторый ці рэалізацыяй сваіх жыццёважных інтарэсаў праз ініцыяванне канфліктаў з суседзямі. Мы ўсе добра памятаем, чым гэта можа скончыцца...

Трэба спадзявацца, што марш у гонар «праклятых жаўнераў» у Гайнаўцы пройдзе мірна і не справакуе мясцовае насельніцтва на сутычкі з правaрадыкальнымі нацыяналістамі.

Трэба спадзявацца, што беларусы, якія спрадвеку жывуць там, не будуць паглядаць з недаверам і непаразуменнем на сваіх польскіх суседзяў, нібы пытаючыся «за што?» і «навошта?», як некалі іх бацькі і дзяды пыталіся ў 1946-м.

**Антон ВАСІЛЕВІЧ**


# ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ
## О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ

гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в дер. Переездная (по генплану №12), дер. Лужки, ул. Банная (по генплану №2), дер. Рудня (участок №2), дер. Рудомейка (участок №2), дер. Прилепская Усяжка (участок №1) Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | 30 марта 2017 г., в 11.00, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний |
| 3 | **Продавец и его адрес** | Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот №1 – площадь 0,0771 га №624883008101000133 дер. Переездная (по г.п. №12)<br>Лот №2 – площадь 0,1347 га №624883005601000172 дер. Лужки, ул. Банная (по генплану №2)<br>Лот №3 – площадь 0,1494 га №624883008501000103 дер. Рудня (участок № 2)<br>Лот №4 – площадь 0,1500 га №624883008601000094 дер. Рудомейка (участок №2)<br>Лот №5 – площадь 0,1090 га №624883008201000111 дер. Прилепская Усяжка (участок №1) |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10904 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) |
| 7 | **Начальная (стартовая) цена продажи** | Лот №1 – 15000,0 рублей<br>Лот №2 – 20000,0 рублей<br>Лот №3 – 6000,0 рублей<br>Лот №4 – 15000,0 рублей<br>Лот №5 – 12000 рублей |
| 8 | **Условия аукциона** | А) продажа по цене не ниже начальной<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики<br>В) без права предоставления рассрочки |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | дер. Переездная – подъездные пути, электричество<br>дер. Лужки, ул. Банная (гп. 2) – подъездные пути, электричество, газ<br>дер. Рудня – подъездные пути, электричество<br>дер. Рудомейка – подъездные пути, газ<br>дер. Прилепская Усяжка – подъездные пути, электричество |
| 10 | **Ограничения в использовании** | Лот 3– водоохранная зона реки и водоема |
| 11 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 12 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка<br>р/с 3641000000614 ОАО «АСБ Беларусбанк» филиал 612 г. Борисов ЦБУ 621 г. Смолевичи УНП 600046563 МФО 153001810 (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 13 | **Порядок предв. озн. в натуре с земельными участками** | Среда в 10.00 |
| 14 | **Прием документов** | В рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 15 | **Окончательный срок приема документов** | 24 марта 2017 года в 17.00 |
| 16 | **Контактный телефон** | 8-01776-44-636, 68-030 |

Расходы по организации и проведению аукциона: лот 1 – 1669,14 бел. руб., лот 2 – 1635,60 бел. руб., лот 3 – 1450,09 бел. руб., лот 4 – 1450,65 бел. руб., лот 5 – 1595,74 и публикация информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).

Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) и копию паспорта покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

3.Счет в банке, на который перечисляется сумма возвращаемого задатка.

# ОАО «СТРОЙТРЕСТ №7»

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

Собрание состоится **30 марта 2017 года** в здании администрации ОАО «Стройтрест №7» (г. Минск, пр. Машерова, 16, зал заседаний) в 15.00.

Регистрация участников собрания – с 14.00 до 14.40 по месту проведения собрания

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Об итогах деятельности Общества за 2016 год и утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества
2. Распределение прибыли и убытков по итогам работы Общества за 2016 год с учетом заключения ревизионной комиссии.
3. О размере и сроках выплаты дивидендов по результатам 2016 года.
4. О внесении изменений и дополнений в Устав
5. Избрание членов совета директоров и ревизионной комиссии.

Для регистрации иметь при себе следующие документы: акционеру общества – паспорт; представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100512859

**ГУ «Гомельоблгидромет»** приглашает к участию в процедуре переговоров по выбору подрядчика для осуществления текущего ремонта пожарной сигнализации и системы оповещения о пожаре склада №1,склада №2, гаражей. Контактные телефоны: 8-0232-260350, 260683, 260392. Предложения к участию направлять с момента выхода приглашения в запечатанных конвертах по адресу: 246029, г. Гомель, ул. Карбышева, 10, ГУ Гомельоблгидромет в течение десяти дней с момента выхода приглашения.

УНП 400254494

Уважаемые акционеры

# ОАО «БЕЛКОТЛООЧИСТКА»!

Очередное собрание акционеров состоится 29 марта 2017 года, начало собрания в 10.00, место проведения – г. Минск, ул. Аранская, 22а. Регистрация проводится с 9.00 до 9.45 (при себе иметь паспорт)

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Об итогах работы общества за 2016 г. и задачах на 2017 г.
2. Утверждение бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках за 2016 г., определение порядка выплаты дивидендов.
3. О направлении использования прибыли в 2017 году
4. Отчет наблюдательного совета и ревизионной комиссии о работе за 2016 г.
5. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
6. Утверждение условий вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

УНП 100071353

Наблюдательный совет